

# ДА 75-ГОДДЗЯ АЛЯКСЕЯ МІКАЛАЕВІЧА ЯКІМОВІЧА

**Дарагі Аляксей Мікалаевіч!**

Вам як педагогу ўласціва тонкае адчуванне духоўнага свету і псіхалогіі дзяцей. Сюжэты Вашых твораў напоўнены пазнавальным зместам, здольныя выклікаць цікавасць, узбагачаць інтэлектуальна, выхоўваць лепшыя чалавечыя якасці. Невыпадкова адукацыйна-выхаваўчы напрамак з'яўляецца важнай старонкай у Вашым творчым багажы. Вы бліскуча выконваеце высакародную асветніцкую і выхаваўчую місію мастацкага слова, з'яўляецеся прыкладам для калег, а Ваша творчая спадчына – прадметам гонару землякоў, каштоўным і карысным падарункам кожнаму беларускаму чытачу. Сардэчна віншуем Вас з 75-годдзем. Няхай кожнае імгненне жыцця радуе і натхняе Вас. Моцнага Вам здароўя, душэўнай раўнавагі і поспеху ва ўсіх зямных справах. ***З ЮБІЛЕЕМ!***

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

**15 кастрычніка 2024 года**
*Гродна - Слонім*

